4. Пичета, В. Исторические судьбы Западной Украины и Западной Белоруссии / В. Пичета. — М.: Моск. рабочий, 1939. — 40 с.

5. Пичета, В. И. Белорусский язык как фактор национально-культурный / В. И. Пичета. — Минск: Навука і тэхніка, 1991. — 31 с.: портр.

6. Пічэта, У. І. Пытанне аб вышэйшай школе на Беларусі ў мінулым / У. І. Пічэта. — Мінск: Навука і тэхніка, 1991. — 48 с.

7. Яновский, О. А. События 1905—1907 гг. в научных интересах первых историков Белорусского государственного университета / О. А. Яновский // Первая российская революция 1905—1907 гг.: к 110-летию начала революционных событий: сб. ст. Междунар. науч. круглого стола, 25 ноября 2015 г., Минск / БГУ, Исторический фак., Каф. истории России; редкол.: О. А. Яновский, В. В. Сергеенкова. — Минск: БГУ, 2015. — С. 6—20.

**Макарэвіч Віталь Сяргеевіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

## ШТРЫХІ ДА ПАЛІТЫЧНАЙ БІЯГРАФІІ ЯЗЭПА ЛЁСІКА

У гісторыі станаўлення беларускай дзяржаўнасці ў пачатку XX ст. адно з найбольш значных месцаў належыць выдатнай асобе — дэлегату I Усебеларускага з’езда, старшыні Прэзідыўму Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, старшыні Выканаўчага камітэта Цэнтральнай рады беларускіх арганізацый, рэдактару газеты «Вольная Беларусь» Язэпу Лёсіку. Акрамя значнай ролі, якую Язэп Лёсік адыграў у палітычных працэсах бурлівых гадоў станаўлення беларускай дзяржаўнасці, яго асоба непасрэдным чынам звязана і са станаўленнем у міжваеннае дваццаціголдзе беларускага мовазнаства, гадамі навуковага сталення Інбелкульта, у якім вучоны быў членам Тэрміналагічнай камісіі, дырэктарам Інстытута навуковай мовы, Беларускім дзяржаўным універсітэтам, дзе ён выкладаў. Немалыя заслугі вучонага, які ў 1928 г. быў абраны акадэмікам, таксама і перад беларускай публіцыстыкай і літаратурай.

Асобе Язэпа Лёсіка прысвечана некалькі публікацый, але ў іх не ўсе факты фіяграфіі гэтай выбітнай асобы знайшлі сваё адлюстраванне. [3—9].

Язэп Юр’евіч Лёсік нарадзіўся ў сялянскай сям’і 6 (18) лістапада 1883 г. у вёсцы Мікалаеўшчына Мінскага павета. Зараз гэта Стаўбцоўскі раён Мінскай вобласці. Бацькі Язэпа былі арандатарамі на землях князёў Радзівілаў. У сям’і было дзесяць дзяцей. Язэп быў апошнім, сёмым хлопчыкам у сям’і.

Пачатковую адукацыю Язэп атрымаў у Мікалаеўскай сельскай школе. Асновы навукі для будучай прафесійнай падрыхтоўкі Язэп Юр’евіч пачаў атрымліваць у Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі (1898—1899 гг.), аднак з трэцяга класа быў адлічаны з-за ўдзелу ў пратэсце супраць набажэнства па забітым 14 лютага 1901 г. міністру народнай асветы Мікалаі Багалепаву. Навучанне ўдалося прадоўжыць толькі за межамі Беларусі. Язэп Юр’евіч паступіў у Глухаўскі настаўніцкі інстытут, але не змог скончыць навукі з-за прызыву ў салдаты. Пасля Язэпу Юр’евічу ўдалося усё ж вытрымаць экзамен на званне настаўніка і пачаць прафесійную кар’еру спачатку выкладчыкам рускай мовы ў Бабруйскай школе садаводства, а пасля ў земскай школе мястэчка Грамеч Ноўгарад-Северскага павета Чарнігаўскай губерні. За ўдзел у рэвалюцыйных выступленнях у 1905 г. быў арыштаваны і знаходзіўся ў Ноўгарад-Северскім

астрогу. У 1907 г. пасля перавозкі на суд у астрог г. Старадуб будучаму акадэмікаму удалося ўцякчы. Пэўны час хаваўся ад уладаў у сваякоў і знаёмых у Стоўбцах, Пецярбургу, на станцыі Краснаўка недалёка ад г. Луганск на Украіне. У 1911 г. прыехаў у Ноўгарад-Северскі да брата Антона, дзе быў зноў арыштаваны і асуджаны на бестэрміновае пасяленне ў Сібіры.

Пакаранне адбываў у гарадах Кірэнск і Бадайбо Іркуцкай губерні. Там пазнаёміўся і пасябрваў з беларускім пісьменнікам, будучым грамадскім і палітычным дзеячас А. Гаруном (А. Прушынскім), які таксама адбываў пакаранне.

У 1912 г. прыяцелі разам уладкаваліся на працу на Мельнічным выселку недалёка ад Кірэнска. Увесь гэты час Язэп Лёсік працягваў падтрымліваць сувязь з газетай «Наша Ніва», якая была цэнтрам беларускага адраджэння, пачаў займацца літаратурнай дзейнасцю. Дэбютаваў таксама як празаік. Першая работа Лёсіка — адаптаваны пераклад старой грэчаскай казкі «Гкеркулес і селянін» пабачыла свет у газеце «Наша ніва» у 1912 г. У гэты ж час у газеце пачалі друкавацца яго зацемкі і карэспандэнцыя, а ў канцы 1912 г. было апублікавана апавяданне «Ня ўсе ж разам, ягамосьці!» і публіцыстычныя зацемкі «Пра лёс беларускага народа і яго мовы». У далейшым Я. Лёсік найболей праявіў сябе ў якасці публіцыста, хаця яго талент ад нараджэння і разуменне задач беларускай асветы і нацыянальнага адраджэня праявіліся ў розных напрамках творчасці — і ў эксперыментах з вершамі, і ў больш характэрных для яго празаічных жанрах. Ён многа займаўся самадукацыяй. Знаходзіў час і для вучэбна-асветнай дзейнасці — у адной з вёсак Язэп Юр’евіч арганізаваў тайную школу, але паліцыя хутка адрэагавала і школу закрылі.

На Радзіму Язэп Юр’евіч змог вярнуцца толькі пасля лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. Адразу пасля вяртання ён актыўна уключаецца ў віхур грамадска-палітычнага жыцця.

З красавіка 1917 г. ён становіцца адным з членаў мінскай секцыі Беларускай сацыялістычнай грамады, адным з лідараў партыі, уваходзіць у склад Беларускага нацыянальнага камітэта, рэдагуе яго газету «Вольная Беларусь» (1917—1918 гг.). На з’ездзе беларускіх партый і арганізацый быў абраны ў склад Выканаўчага камітэта Цэнтральнай рады беларускіх арганізацый, увайшоў у склад Вялікай беларускай рады, быў дэлегатам І Усебеларускага з’езда. Публічна выступіў з асужденнем разгона съезда большевиками.

Да гэтых звестак можна таксама дадаць, што 15 ліпеня 1917 г. ён, сярод 26 іншых прадстаўнікоў сацыялістычных партый нацыянальных меншасцей быў уключаны шостым у спіс на балатаванне ў гласныя Мінскай гарадской думы. І быў абраны гласным. Вядома, што гэтыя функцыі ён выконваў да 22 лістапада 1917 г., калі ўжо ішла падрыхтоўка да Усебеларускага з’езда. Што цікава, у спісах, дзе дарэчы пад другім нумарам ішоў таксама Аркадзь Смоліч, ён запісваецца як рэдактар газеты «Вольная Беларусь», падаў адрас пражывання — вул. Мала-Георгіеўская, д. 12. Партыйная прыналежнасць была адзначана як — член мінскага аддзела БСГ. Ёсць сярод архіўных дакументаў і заява з просьба аб звальненні ад абавязкаў гласнага, якая датуецца 22-м лістапада 1917 г. Заява напісана почыркам іншай асобы, і толькі подпіс і дата зрбленыя рукой Я. Лёсіка. Яшчэ адна цікавая акалічнасць — і ў дакументах, і ў подпісе Язэп Лёсік падаваў сваё імя і імя па-бацьку не як Язэп Юр’евіч, а як Іосіф Ягоравіч. [10, арк. 36—36 адв, 42; 11, арк. 9]

Пасля канчатковага усталявання ў 1920-м годзе ўлады бальшавікоў у Мінску, Я. Лёсік, у адрозненне ад многіх іншых ключавых фігур Найвышэйшай Рады БНР, якія накіраваліся ў эміграцыю, прыняў рашэнне застацца ў Мінску. Без сумнення на далейшы лёс Лёсіка значную ролю аказаў таксама Усевалад Ігнатоўскі. Менавіта дзякуючы яго падтрымцы Лёсік змог працаўладкавацца ў 1920-м. У лістападзе ён піша заяву на залічэнне яго на пасаду ў культурна-асветніцкі аддзел Народнага камісарыята земляробства ССРБ. На заяве свой подпіс чырвоным алоўкам з рашэннем залічыць яго адразу на пасаду намесніка начальніка ўпраўляючага аддзелам, паставіў уплывовы тады Усевалад Ігнатоўскі — тагачасны наркам земляробства. Язэп Лёсік быў таксама там лектарам беларускай мовы. [1, 2] Не малую відаць ролю ў далейшым лёсе Язэпа Лёсіка, які становіцца таксама членам Тэрміналагічнай камісіі пры Наркамаце асветы БССР, таксама адыграў Ігнатоўскі, які з 1921 г. заняў пасаду наркама асветы БССР.

### Бібліяграфічны спіс

1. Выписки из протоколов допросов, показаний Прищепова, Ластовского, Некрашевича, Цвикевича, Тарашкевича, Красковского. Лёсика, Езовитова, Прокулевича (копии документов из КГБ при СМ БССР по акту от 28.07.1961 г.) // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 250. — Воп.6. — Спр. 135.
2. Дело Лёсика Иосифа Юрьевича // НАРБ. — Ф.48. — Воп.8. — Спр. 312.
3. Гарэцкі, М. Лёсік Язэп / Гарэцкі М. // Гісторыя беларускае літаратуры. — Вільня, 1920.
4. Багдановіч, І. «Гэтага слаўнага пісьменніка чакаець яшчэ слаўнейшая будучыня» / І. Багдановіч, А. Жынкін // За передовую науку. — 1990. — 4 мая.
5. Мяснікоў, А. «Жывіце без мяне...» / А. Мяснікоў // Полымя. — 1992. — № 1.
6. Мяснікоў, А. Нацдэмы. Лёс і трагедыя Фабіяна Шантыра, Усевалада Ігнатоўскага і Язэпа Лёсіка / А. Мяснікоў. — Мінск, 1993.
7. Беларускія пісьменнікі: Біябібліяграфічны слоўнік. Т. 4. Мінск, 1994.
8. Лёсік, А. З жыцця Язэпа Лёсіка / А. Лёсік // На суд гісторыі. — Мінск. — 1994. — С. 144—159.
9. Хвіланчук, Ю. Навуковая дзейнасць Я. Лёсіка ў перыяд станаўлення нацыянальнага мовазнаўства // Роднае слова. — 2014. — № 14. — С. 41—43.
10. НАРБ. — Ф. 24. — Воп.1. — Спр. 3666. — Арк. 36—36 адв, 42.
11. НАРБ. — Ф. 24. — Воп.1. — Спр. 3669. — Арк. 9.

**Малиновская Эмма Леонидовна**

*Музей истории Белорусского государственного университета (Минск, Беларусь)*

## С. Я. ВОЛЬФСОН — ОСНОВОПОЛОЖНИК ФИЛОСОФСКОЙ НАУКИ В БЕЛАРУСИ

Октябрьская революция 1917 г. кардинальным образом повлияла на развитие философской мысли в России. Значительная часть ученых, представляющих религиозно-философские направления, по политическим убеждениям была вынуждена уехать за границу, где продолжила разработку идей всеединства, персонализма и др. В советском же государстве признание получило материалистическое марксистское мировоззрение. Философия